**Паважаны Дзмітрый Мікалаевіч!**

Шчыра віншуем Вас з днём нараджэння! І хаця дата, да якой Вы падыйшлі не надта вялікая, але кожны Ваш год на шляху да яе быў напоўнены мэтанакіраванай і плённай працай як у літаратуры, так і ў паўсядзённым жыцці. Таму мы, Вашы калегі, лічым 45-ы Ваш дзень народзін юбілейным і жадаем выказаць самыя цёплыя словы ў Ваш адрас.

На працягу працы ў Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі Вы праявілі сябе як спецыяліст высокага класу, прафесійны і адказны супрацоўнік, ініцыятар і здольны арганізатар многіх мерапрыемстваў і праектаў. Адзін толькі “Словадром” чаговарты! Яго пасяджэнні вось ужо тры гады запар з задавальненнем наведваюць гродзенскія аматары літаратуры і палемікі. Заслугоўвае павагі праект грамадзянскай паэзіі “Пад мірным небам Беларусі”, які стаў традыцыйным актам праяўлення патрыятычных пачуццяў гродзенскіх творцаў праз паэзію грамадзянскага гучання. Шмат сіл і ведаў, дабрыні душы і спагады аддаяцё Вы пачынаючым аўтарам, працы з моладдзю і дзейнасці грамадскай літаратурнай школы. Вашы літаратуразнаўчыя і крытычныя артыкулы, рэцэнзіі і водгукі, друкаваныя ў сродках масавай інфармацыі і сеціве Інтэрнет, здабылі Вам славу аўтарытэтнага літаратара, глыбокага паэта і публіцыста. А выказаная Вамі ідэя саюзнасці стала асноватворнай у дзейнасці ўсёй пісьменніцкай арганізацыі Беларусі. І пры гэтым Вы застаецеся сціплым, тактоўным, інтэліентным чалавекам з адкрытым сэрцам і балючай душой.

Жадаем Вам, дарагі наш сябра, калега, партнёр, супрацоўнік, святла і міру ў душы, здароўя і Божай апекі, асабістага шчасця, радасці і творчага натхнення, новых кніг і здзяйсненняў! Заставайцеся такім, якім мы Вас ведаем, на доўгія гады. З юбілеем!

**З любоўю, калектыў ГАА СПБ**

